# ЗАКЛЮЧЭННЕ.
# СВЕТ У ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст.

У першай чвэрці XXI ст. чалавецтва працягвае сутыкацца з мноствам глабальных выклікаў, большасць з якіх уяўляюць прамую або патэнцыйную пагрозу яго існаванню. Адной з самых сур'ёзных застаецца небяспека глабальнага ваеннага канфлікту з выкарыстаннем ядзернай зброі. Пасля заканчэння «халоднай вайны» пашырэнне гэтага віду зброі выйшла далёка за межы традыцыйнага «ядзернага клуба», што павялічвае верагоднасць яго выкарыстання ў лакальных канфліктах.

Не меншую небяспеку ўяўляе хімічная і біялагічная (бактэрыялагічная) зброя. Нягледзячы на міжнародныя забароны, параўнаўчая прастата і нізкі сабекошт яе вытворчасці не выключаюць з'яўлення такой зброі ў арсеналах нестабільных дзяржаў і экстрэмісцкіх груповак. Захаванне міру, умацаванне сістэмы міжнароднай бяспекі, спыненне гонкі ўзбраенняў і зніжэнне ўзроўню глабальнай ваеннай напружанасці застаюцца найважнейшымі задачамі для ўсяго чалавецтва.

Выступаючы на Сусветным саміце па барацьбе са змяненнем клімату ў Дубаі ў 2023 г., Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліў, што імкненне да ваеннага першынства і ўзброеныя канфлікты, якія працягваюцца, з'яўляюцца ключавымі крыніцамі сучасных глабальных праблем. Пазіцыя нашай краіны адлюстроўвае міралюбную знешнепалітычную лінію Беларусі, арыентаваную на прадухіленне канфліктаў, развіццё дыялогу і ўмацаванне міжнародных інстытутаў.

Адным з найбольш вострых выклікаў застаецца міжнародны тэрарызм. Ва ўмовах нестабільнасці і ўзмацнення ідэалагічнага радыкалізму расце верагоднасць выкарыстання тэрарыстамі зброі масавага паражэння. Сучасныя тэрарыстычныя арганізацыі актыўна выкарыстоўваюць гібрыдныя формы барацьбы: інфармацыйныя і кібердыверсіі, распаўсюджванне дэзінфармацыі. Іх дзеянні скіраваныя на дэстабілізацыю дзяржаў, разбурэнне грамадскіх сувязей, запалохванне насельніцтва.

Да ліку глабальных праблем належыць і пагаршэнне экалагічнай абстаноўкі. Забруджванне атмасферы і вод Сусветнага акіяна,

дэградацыя глеб, знікненне лясоў і рост аб’ёмаў цвёрдых адыходаў патрабуюць тэрміновых і скаардынаваных дзеянняў на міжнародным узроўні. Усё большую значнасць набывае пераход да «зялёнай энергетыкі», якая ўключае развіццё аднаўляльных крыніц энергіі (атамнай, вадароднай, сонечнай, ветравой, геатэрмальнай і інш.), бо яны не ўтвараюць парніковых газаў падчас эксплуатацыі. Аднак выкарыстанне такіх тэхналогій (атамнай і вадароднай) патрабуе выканання высокіх стандартаў бяспекі і міжнароднага кантролю. Беларусь, валодаючы ўласнай атамнай электрастанцыяй, таксама ўдзельнічае ў агульнасусветным энергетычным пераходзе, падтрымліваючы прынцыпы ўстойлівага развіцця.

Сур’ёзнай пагрозай застаецца змяненне клімату. Рост сярэдняй тэмпературы Зямлі, пачашчэнне прыродных катастроф, раставанне ледавікоў, павышэнне ўзроўню вод Сусветнага акіяна і апустыньванне цэлых рэгіёнаў аказваюць прамое ўздзеянне на ўсе сферы жыцця. Беларусь таксама сутыкаецца з наступствамі гэтых змен — ад засух і нестабільных сезонаў да пагрозы страты біяразнастайнасці. Міжнародныя намаганні па абмежаванні глабальнага пацяплення рэалізуюцца ў межах Рамачнай канвенцыі ААН, Кіёцкага пратакола, Парыжскага пагаднення, дзе Беларусь выступае бокам і ўдзельнікам перамоў.

Вострай застаецца праблема голаду. Нават напачатку 2020-х гг. каля 10 % насельніцтва Зямлі пакутуюць ад хранічнай нястачы харчавання. Сітуацыя ўскладняецца ўзброенымі канфліктамі, кліматычнымі зменамі, ростам цэн і хуткім ростам колькасці насельніцтва, асабліва ў найбяднейшых краінах Афрыкі і Азіі. Беларусь, валодаючы аграрным патэнцыялам, спрыяе ўмацаванню глабальнай харчовай бяспекі, развівае ўстойлівую сельскую гаспадарку і ўдзельнічае ў міжнародных гуманітарных ініцыятывах.

Пандэмія COVID-19 зрабілася сур’ёзным выпрабаваннем для ўсяго свету, нагадаўшы, наколькі чалавецтва ўразлівае перад глабальнымі эпідэміямі. Яна агаліла слабыя месцы сістэм аховы здароўя, закранула ўсе сферы жыцця, ад эканомікі да адукацыі, і паказала неабходнасць міжнароднай салідарнасці і абмену досведам. Беларусь, нягледзячы на абмежаванні, захавала сацыяльную стабільнасць і забяспечыла даступнасць медыцынскай дапамогі для насельніцтва.

Выклікі сучаснасці фарміруюцца і пад уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу. На парадак дня выходзяць пытанні этыкі і рэ-

гулявання ў сувязі з развіццём штучнага інтэлекту, геннай інжынерыі, лічбавізацыі. Гэтыя працэсы патрабуюць своечасовага прававога і грамадскага асэнсавання, каб пазбегнуць тэхналагічнай няроўнасці і забяспечыць захаванне базавых гуманістычных каштоўнасцей.

Вырашэнне глабальных праблем магчымае толькі на аснове міжнароднага партнёрства і салідарнасці. У гэтым кантэксце асаблівую ролю адыгрывае Канцэпцыя ўстойлівага развіцця, якая рэалізуецца пад эгідай ААН. Яна скіраваная на ліквідацыю беднасці, забеспячэнне эканамічнага росту, роўны доступ да адукацыі і медыцынскай дапамогі, барацьбу супраць змянення клімату, абарону навакольнага асяроддзя. Беларусь як адказная дзяржава і ўдзельнік міжнародных ініцыятыў зацікаўлена ў пабудове справядлівага, бяспечнага і ўстойлівага свету для цяперашняга і будучых пакаленняў.